**ПЕЧАНЕЖ** – вёска ў Беладубраўскім **сельскім Савеце, за** 14 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў - Сураж, 178 км ад Магілёва, на поўначы – штучная сажалка. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Саматэвічы – Касцюковічы.

Заснавана ў 1920-х г. перасяленцамі з суседніх вёсак. З сакавіка 1924 г. у БССР, з 17.07.1924 г. у Касцюковіцкім раёне. У Вялікую Айчынную вайну 29.09.1943 г. вызвалена ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Паводле перапісу 1959 г. — 405, у 1970 г. 364 жыхары. У 1986 г. – 66 гаспадарак, 162 жыхары, цэнтр саўгаса «Печанеж». Працавалі машынны двор, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, клуб, бібліятэка, сталовая, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт, пачатковая школа, аддзяленне сувязі, лазня, інтэрнат. Ген. план забудовы распрацаваны ў 1968 г. Магілёўскімі абласнымі праектнымі майстэрнямі Белдзяржпраекта. Складаецца з трох кароткіх, прамалінейных шыротных вуліц, забудаваных двухбакова драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. На ПнЗ адасоблены ўчастак забудовы.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі жыхары адселены.